**Яна Гульцяева**

# Linea lateralis

раман

у дзвюх кнігах

## Кніга першая

…як рыбы,
што плаваюць у моры і ў рэках,
чуюць
віры свае…

*Францішак Скарына*

Світло складається з темряви
і залежить лише від нас.

*Сергій Жадан*

Мы пазнаёміліся з Міраю задаўга да дня Z. Да чорнага дня Z, які ніколі не павінен быў здарыцца, але здарыўся. Ён расцягнуўся на доўгія, крывавыя месяцы, а мы – тыя, кім мы былі раней, – памерлі.

Ужо іншымі мы перажывалі яго, іншымі мы намагаемся жыць пасляпадчас яго. Але як менавіта, я пакуль не магу апісаць, бо ўнутры нас – не мы. Унутры нас – забітыя, закатаваныя, пакалечаныя; унутры нас – смерць ды скруха, мы – могільнік. На руках нашых – такі ж самы, як быў на вашых,

дарагая Сімона, – агромністы, цяжкі, агідны труп, і ці знойдзем мы месца на гэтай зямлі, каб пахаваць яго?

Мы самі і ёсць тое месца. Мы носім і неба сваё, і пагосты свае, і турмы свае, і свае СІЗА, і залы судоў, і вуліцы гарадоў нашых – носім з сабой, у сабе. Жыццё поўнае, жыццё легкадушнае, жыццё жывое ўнутры нас пастаўленае на паўзу.

Мы пазнаёміліся і сустракаліся з Міраю задаўга да дня Z, які разбіў ушчэнт нашыя апошнія ілюзіі, нашую і без таго кволую надзею на лепшае заўтра. Ён, аднак, не змог знішчыць, не змог перамагчы галоўнага – нашай патрэбы і нашай здольнасці любіць. Любіць тут і цяпер, любіць насуперак нелюбові навокал, любіць да канца.

Слова маё служыць толькі праўдзе і толькі любові. Размотваючы клубок, разважаю: і ўсё ж любоў – панятак адносны, дый праўда ў кожнага свая, і часта зусім немагчыма паяднаць, прымірыць любоў і праўду. Але, клубок разматаўшы да канца, трымаючы пачатак ніткі ў руцэ, пераконваюся ў чарговы раз: любоў і праўда – рэчы вельмі простыя, рэчы адназначныя, асабліва калі прымiраныя. Свабода з імі быць – вось у чым векавечная складанасць.

Але ж in amōre veritas, in vēritāte amor, хіба не так? Як думка адчутая, а пачуццё прадуманае. Як сэрца і розум адно аднаму насамрэч не ворагі... Ці ўсё ж такі намагацца прымірыць уяўныя процілегласці – справа няўдзячная? Ці не збядняе гэта свет, ці не пазбаўляе яго рамантычнай прыгажосці супярэчнасці?

Магчыма, цалкам магчыма. Але Мірына гісторыя – гісторыя прымiраных, хай і не адразу, любові і праўды, і мне не застаецца нічога іншага, як проста яе пераказаць.

## Дамова

– Ну, вось. Я прыйшла. Добры дзень.

– Я рада, Міра, вітаю вас! Праходзьце, калі ласка.

Вешаю ейны плашч, стаўлю парасон. Яна яшчэ вагаецца, бачна, хвалюецца. (– Сюды, калі ласка.) Азірае пакой, дзьмухае на далоні: сёння дождж і толькі плюс пяць.

– Гарбаты? кавы? вады? – прапаноўваю.

– Калі можна, гарбаты. Дзякую.

– Дзве хвілінкі. Вы сядайце, калі ласка, уладкоўвайцеся, адчувайце сябе… свабодна. Без гэтага ў нашай справе аніяк.

Першы раз мы сустрэліся з ёю ў верасні, амаль тры месяцы таму. Звычайна я не раблю так, не знаёмлюся з імі на вуліцы; наогул яны самі мяне знаходзяць: “рынак” невялікі, “спецыялістаў” няшмат. Прыходзяць яны да мяне таксама нячаста, часцей гэта дыстанцыйныя сустрэчы ці ліставанні. Людзям так прасцей, дый большасць маіх “кліентаў” пражываюць у іншых краінах.

Сустрэча тая была ў найвышэйшай ступені выпадковай.

Тратуары на вуліцах і мастах нашага горада досыць вузкія, гараджане ж у большасці сваёй – прыязныя, ветлівыя. Прынята выбачацца, нават калі няма за што: мы ж невінаватыя, што тратуары як былі вузкімі стагоддзі таму – такімі і застаюцца сёння. Я ішла па Старым мосце ў бок царквы Святога Жака, яна – насустрач; адна мусіла запаволіцца і прапусціць другую; я ёй – дзяжурную ўсмешку і *pardon!*, а з яе, чую, вылецела *прабачце*. Роднае *прабачце* за дзве з паловаю тысячы кіламетраў ад дому. Даўно не чула, не чакала.

Гляджу на яе: мабыць, нядаўна прыехала, яшчэ не абвыклася, а можа, проста турыстка. Ці бываюць турысты сумнымі? Некалькі секундаў, але паспяваю заўважыць, што пагодны дзень не надта цешыць яе: сонечных акуляраў не носіць, бо звычайныя, для зроку, а вочы за імі журботныя. Па горадзе паўднёвым з такімі паўночнымі вачамі хадзіць не comme il faut, дрэнная звычка, падумала я тады, хоць сама пазбавілася яе таксама не адразу…

– Калі ласка, Міра, частуйцеся, – стаўлю на стол паднос с кубкамі і шакаладнымі цукеркамі. – Крыху сагрэліся?

– Так, дзякую, усё добра, – адказвае яна.

…Я тады проста дала ёй сваю візітоўку, картку з іменем і нумарам тэлефона. Звычайная цікавасць, патрэба, туга ці безнадзейнасць – тыдзень таму яна такі патэлефанавала. І атрымліваецца, нашая размова яе не напужала – яна прыйшла.

Гляджу на гадзіннік: 16:10. Яна таксама скіроўвае позірк на лічбы:

– Колькі ў мяне, мадам? Гадзіна? Сорак пяць хвілінаў?

– Напэўна без *мадам* давайце. Проста Фло, калі ласка.

– Дзякую… Фло, – сказала яна і прыязна ўсміхнулася.

– Як пойдзе, Міра, пабачым. Я нікуды не спяшаюся. Вырашаць вам.

Разглядаю яе. Ні пра што не думаю. Ведаю, што шлях перад намі доўгі і непрадказальны, навучылася перад прорвай проста затойвацца. Каб не сапсаваць, не спудзіць… Што ж, далей па “рэгламенце”, як і рыхтавалася:

– Ну, пачнём? Перадусім, дзякую, што запоўнілі анкету, якую я даслала вам. Я прагледзела яе. Цяжка было адказваць? Можа, нешта падалося дзіўным?

– Ды не, пытанні як пытанні. Я і сама іх сабе задаю каторы год.

– Тады пройдземся па іх? Магчыма, зможаце падрабязней адказаць, чым тут напісалі. Галоўнае, кажыце, калі ласка, як ёсць, па магчымасці шчыра. Гэта прынцыпова істотна.

– Так, вядома. Заўсёды стараюся казаць, як ёсць, тым больш… які сэнс цяпер ухіляцца? Сваімі нагамі прыйшла… Пытанні гэтыя дапамаглі мне ўбачыць, што вы сапраўды мой апошні шанец.

Яны заўсёды прамаўляюць гэтыя словы. Такіх, як Міра, у мяне было ўжо з дваццаць – жанчын, мужчынаў, падлеткаў, але я ніяк не прывыкну да гэтага пафасу.

– Міра, першае, пра што я спытаю… яно крыху па-за анкетай, улічваючы сітуацыю... Гэта ж не настальгія прывяла вас да мяне? Не праблемы эміграцыі, адаптацыі, адзіноты? Важна, каб вы разумелі правільна: у гэтых пытаннях я вам нічым не змагу дапамагчы. Уладкаванне на новым месцы, новая праца ці яе адсутнасць, складанасці з новымі знаёмствамі, адарванасць ад сяброў і родных, ад прывычнага жыцця…

– Не, Фло, – рашуча перапыніла яна, – эміграцыя і настальгія ні пры чым. Яно вельмі няпроста даецца, але галоўная мая праблема не ў гэтым. Не столькі ў гэтым.

– І не ў тым, што працягвае адбывацца дома, у нашай краіне?

– Не, шаноўная Фло. – Адказвала яна спакойна, значыць, сапраўды пра ўсё думала, усё ўзважвала. – Шчыра кажучы, я не разумею... не разумею, як атрымліваецца жыць, як атрымліваецца працягваць, калі… Але вось жа, мы прызвычаіліся і да гэтага болю, да гэтага стану рэчаў… Прычына, з якой я ўсё ж такі вырашыла не адмаўляцца ад вашых паслугаў, у іншым. Я ўсведамляю розніцу. Задавайце, калі ласка, свае пытанні.

Не магу быць упэўненай, што ейны статус nouvelle arrivante (яна сказала, што прыляцела на пачатку траўня) не паўплываў на прынятае рашэнне, але мушу паверыць на слова.

– Ну, добра. Тады па анкеце. Як вы ацэньваеце свой цяперашні псіхічны стан, Міра?

– Хутчэй здавальняюча, чым наадварот. Нягледзячы ні на што.

– А раней? Было з чым працаваць?

– Было з чым. Як у большасці з жывых.

– То-бок, вы праходзілі псіхатэрапію?

– Не. Я не мела сродкаў на добрага спецыяліста, а ў дзяржаўную ўстанову не хацела звяртацца. Не давярала ім.

– Але ж вы тут пазначылі, што псіхалагічную дапамогу атрымлівалі?

– Атрымлівала, гады тры таму. Гэта былі некалькі гадзінаў бясплатных лекцыяў і пяцігадзінны групавы майстар-клас. Вядомая ў маім горадзе спецыялістка, дасведчаны, таленавіты чалавек. Яна, скажам так, дала мне ключы ад шмат якіх замкоў і спіс карыснай літаратуры пашырыла. Тым і дапамагла. Я ёй вельмі ўдзячная, усё гэта было надзвычай своечасова.

– Значыць, тэрапія, якой бы яна ні была, аказалася, на ваш погляд, даволі эфектыўнай? Я правільна разумею?

– Правільна.

– Але ж вы тут, у мяне.

– Тут, у вас, – адказала яна і, паглядзеўшы на мяне лагодна, працытавала, старанна вымаўляючы замежныя словы, брата нашага Сартра: – *On se defait d'une nevrose, on ne se guerit pas de soi.*

Складана не пагадзіцца.

Усміхаецца мне, усміхаюся ёй у адказ. Яна не прыгнечаная, але штосьці не адпускае яе. Гэтае штосьці цяпер і мой клопат. Мушу, паводле “інструкцыі”, удакладніць да канца:

– Міра, тое, што прывяло вас да мяне… вы ж спрабавалі падзяліцца гэтым? З сябрам, напрыклад?

– Вядома. Цягам жыцця нават не з адным.

– Не дапамагло?

– Доўгатэрмінова – не.

– А з мужам? Вы пазначылі тут сваё сямейнае становішча.

– Вядома ж! Ён і не быў бы мне мужам, не быў бы мне найлепшым сябрам, калі б мы не былі блізкія, не маглі шчыра размаўляць пра ўсё, што нас турбуе. Боль сышоў, з'явілася пачуццё бяспекі, я ўрэшце навучылася бываць шчаслівай, забываць на гадзіну-другую, на паўдня, у якім свеце мы жывем. Але ведаеце… заўсёды застаецца штосьці такое, чаго так і не вымавіш, не выкажаш таму, хто побач, ды яшчэ так, каб ён сапраўды цябе зразумеў, каб ён адчуў менавіта тое, што адчуваеш ты... Але я думаю, няма сэнсу ані намагацца, ані бедаваць з гэтай нагоды. Гэта нармальна. Тым больш

калі ёсць, напрыклад, музыка. Яна дазваляе адпачыць ад вечнага пошуку трапных словаў. Ну, а так... муляе часам, нагадвае табе жыццё рэгулярна пра марнасць, пра пустэчу, пра канец... З ім, дарэчы, тое ж самае. Напэўна, з усімі намі так. Так і жывем, спадзяваючыся з апошніх сілаў на лепшае.

– У анкеце вы пазначылі, што не звярталіся і да псіхаактыўных рэчываў: цыгарэты, алкаголь, наркатычныя сродкі… Не звярталіся – ці не дапамагло?

– Фло! – усклікнула здзіўлена Міра, быццам я выказала дапушчэнне зусім немажлівае. – Я чалавек нудны і занадта асцярожны для такіх прыгодаў. Дый сумнявалася, што гэта дапаможа. Бачыла, што па-сапраўднаму не дапамагае нікому. Дый не цягнула.

Мушу задаць інтымнае пытанне, бо ў анкеце бачу прочырк.

– Міра, вы не лічыце сябе верніцай? Бог, рэлігія, вера – вы не знаходзіце ў іх выйсце?

На некалькі секундаў яна заплюшчыла вочы.

– Не, – пакруціла галавой, – на гэта ў мяне па-ранейшаму няма адказу. Дакладней, ён настолькі неабдымны і, разам з тым, вельмі просты, натуральны… Але ж не. Тут нешта большае, тут не зводзіцца ўсё да пытання веры.

– Кажуць, Бог большы за ўсё найвялікшае?

– У гэта веру. Не веру толькі, што кожны чалавек здольны знайсці ў Ім вырашэнне ўсіх праблемаў, адказы на ўсе свае пытанні. Прынамсі, я не магу. Пакоры духу майму бракуе, гэта я прызнаю.

– А творчасць? – гляджу на яе ўважліва, бо звычайна гэта апошняе, на што ў іх ёсць надзея. – Спрабавалі перадаць гэтае *нешта большае* праз творчасць?

– Так, спрабавала. Хто ж не спрабуе, – паціснуўшы плячыма, адказала яна спакойна (адчаю няма, гэта важна для нашай з ёю супрацы).

– Але?

– Але I failed. Можа, у працэсе атрымаецца патлумачыць. – Крыху памаўчалі. – Таму я і прыйшла да вас: хацела б паставіць кропку ў гэтай гісторыі, хацела б пазбавіцца яе – і пайсці далей. Бо немагчыма жыць з гэтым баластам, не хачу больш так.

Яны чытаюць мае ўмовы перад першай сустрэчай, але я павінна яшчэ раз агучыць іх перад тым, як мы падпішам дакумент.

– Міра, вы азнаёміліся з умовамі, на якіх я змагу вам дапамагчы, правільна? Калі ласка, пасля кожнага сцверджання скажыце *так*, калі вы з ім згодная.

– Добра.

Зачытваю:

*– Я, Міра Ждановіч, разумею, што ніжэй апісаныя паслугі – не дапамога псіхолага: я не акрэсліваю ніякіх праблемаў, не стаўлю ніякіх мэтаў і таму не чакаю ніякага выніку ад нашага ўзаемадзеяння з Фларыянай Крус.*

– Так.

*– Адзінае, што я зраблю, – раскажу ўсё, што маю патрэбу расказаць.*

– Так.

*– Адзінае, што зробіць Фларыяна Крус, – уважліва выслухае ўсё, што я раскажу.*

– Так.

*– Яна ніяк не ацэніць ні сказанае, ні мяне саму; не падтрымае, не асудзіць ні мяне, ні іншых. Я не атрымаю ад Ф. К. ніякай карысці.*

– Згода.

*– Калі мне не палягчэе, гэта толькі мая адказнасць.*

– Згодная.

*– Дадзеная паслуга бясплатная.*

– Так. Дзякую. Дзіўна.

*– Я ніколі не спытаюся, навошта Ф. К. аказвае такога кшталту паслугі.*

– Ніколі.

*– Я ніколі не спытаюся, што з маёй гісторыяй станецца апасля. Я разумею і прымаю, што Ф. К. мае ўсе правы на яе і можа рабіць з ёю ўсё, што пажадае.*

– Так, прымаю.

*– Я дапускаю і прымаю, што Ф. К. можа абысціся з гісторыяй несумленна. Я даю абяцанне ніколі і ніякім чынам не спрабаваць на яе паўплываць.*

– Даю.

*– Я дапускаю і прымаю, што Ф. К. можа нічога не зрабіць з маёй гісторыяй, нібыта я яе і не расказвала.*

– Так, прымаю.

*– Я ніколі не буду шукаць інфармацыю пра асобу Ф. К.,* – зачытала я і дадала з усёю шчырасцю: – Бо вы праўда нічога не знойдзеце.

– Абяцаю.

Мне падабаецца годнасць, з якой яна трымаецца. Пытанні, ясна ж, знарок правакацыйныя.

Агучваю апошняе:

*– На якой бы мове мы ні размаўлялі паміж сабою, якой бы мовай ні карысталіся людзі, пра якіх будзе ісці гаворка, мовай зафіксаванай гісторыі, калі да таго дойдзе, будзе беларуская.*

– Цудоўна.

Працягваю ёй дамову і асадку – яна, не вагаючыся, падпісвае. C’est fait.

– Часам людзі яшчэ доўга думаюць, Міра. Параўноўваюць, ведаеце, з мацярынствам, напрыклад, сурагатным. Маўляў, носіш у сабе, носіш пад сэрцам, у сэрцы – і вось трэба аддаць, вырачыся, забыць. І ніколі не ведаеш, што зробіць іншы, што будзе далей. Не ўсе на такое згодныя.

– Так, зразумела. Але я не магу сказаць, што адчуваю сябе гаспадыняй ці… маці гэтай гісторыі... – Яна памаўчала. – Наадварот. Я стамілася ад яе, вельмі стамілася. Калі выпадковасць становіцца ўсім тваім жыццём, гэта…

– Вы не верыце ў лёс, Міра, у наканаванне? Магчыма, так і павінна было стацца? Магчыма, менавіта такі быў на вас план?

Яна сумна ўсміхнулася і задала ў сваю чаргу наіўнае пытанне, на якое я ніколі не адказваю:

– Фло, усё ж такі навошта вам гэта? Людзі забіраюць ваш час, расказваюць пра свае праблемы, пра свае заблытаныя жыцці, вы іх слухаеце доўга, гадзінамі, днямі – і нават грошай не бераце! У чым логіка? – Раптам ёй падумалася супрацьлеглае: – А можа, трэба вас баяцца? Шкодзіце пасля ўсім гэтым расказчыкам?

– Не адкажу на гэта, Міра. Магчыма, вы пазней зразумееце. Але баяцца мяне дакладна не варта.

– То-бок, я павінна даверыцца вам? Чалавеку, якога бачу другі раз у жыцці? Ха-ха, як смешна.

Эмоцыі. Звычайная сінусоіда: не магу не расказаць – як гэта я буду абы-каму давярацца? – урэшце ўсё расказваю, бо з кім яшчэ і як мне падзяліцца? Гэты недавер, хоць і хвілінны, заўсёды малапрыемна чапляе мяне. Момант праўды для яе: ці хопіць ёй духу падзяліцца самым крохкім, вымавіць невымоўнае, зноў усё, што раніла, перажыць? Ці хопіць цярплівасці сфармуляваць адпаведнымі, дакладнымі словамі? Момант праўды для мяне самой: ці засмуціць мяне адмова? Я спадзяюся на давер, на шчырасць. Але мы незнаёмыя. Ніхто нікому нічога не вінны. Я заўсёды гатовая да адмовы.

– Міра, нагадаю вам: усё ў гэтым пакоі – добраахвотна, вы ў любы момант можаце спыніцца і пайсці. Я не прымушаю і ніколі не буду прымушаць вас.

Яна паднялася і стала ля акна да мяне спінаю. Я чакала.

Пакуль яшчэ чужая, невядомая, трымае дыстанцыю, намагаецца трымаць сябе ў руках. Якая яна? Што схаванае ў ейным *штосьці*? Я не раблю здагадак, не аналізую яе знешні выгляд, не звяртаю ўвагі на рэдкія нервовыя рухі, хоць заўважаю і думаю, што разумею іх. Я не тлумачу яе збянтэжанасць сацыяльным ці якім іншым статусам – я не займаюся счытваннем, яно заўсёды заводзіць не туды, будуе паміж двума высокую, глухую сцяну няшчырасці, а такія гульні мне нецікавыя. Калі ты расказваеш, чалавек, я проста слухаю. Калі ты расказваеш, я проста гляджу табе ў вочы, у якіх адбіваецца лёс не толькі твой, і не ведаю, што ты бачыш у маіх, не ведаю, ці ты пазнаеш мяне – і пакуль не хачу ведаць. Плыві, мне проста хочацца, каб ты даверылася плыні. Я проста люблю, калі чалавек…

– Не ведаю, з чаго і пачаць, – сказала яна, не адыходзячы ад акна. – Насамрэч гэтая гісторыя… сама не разумею, чаму яна важыць для мене як самалёт, чаму немагчыма пад ёю дыхаць, чаму яна ўсю мяне сабою запаўняе, трымае нібы ў клюшні, за самае горла… Ай, Фло, нічога важнага. Звычайнае бярэмя жарсцей чалавечых, усё пустое…

– Але ж досвед падказвае мне, Міра, што пустое не можа важыць як самалёт. Давайце, раскажыце мне пра яго, пра свой цяжар. З самага пачатку.